Газэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Комітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 39 (421) Серада, 6 красавіка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Да VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Сёмы Ўсебеларускі Зьезд Саветаў адбыўся тады, калі рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі завяршалі сваю напружаную працу па загойваньню тых балючых ран, якія былі нанесены ім нямецкай і белапольскай акупацыямі, а таксама бандытызмам. Ён праходзіў пры наліччы гадавога вопыту працы пасьля далучэньня да старай часткі Савецкай Беларусі частак тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губэрняў і новага раёнаваньня БССР.

З таго часу прашло амаль што ня два гады. За гэты час рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі зрабілі вялікія дасягненьні. Становішча сельскай гаспадаркі значна палепшылася і ўзмацнілася; разьвіцьцё прамысловасьці шпаркімі крокамі пашло наперад і ў сваім пасьпяховым руху абагнала тэмп разьвіцьця сельскай гаспадаркі; дабрабыт працоўных мас значна палепшыўся; вялікія посьпехі зрабіла ў сваім разьвіцьці коопэрацыя, выціскаючы паступова як у горадзе, так і ў вёсцы прыватнага гандляра і растаўшчыка-кулака; значна разьвінуліся культурна-асьветныя і лекавыя ўстановы, культурнасьць і палітычная сьвядомасьць працоўных мас далёка сягнулі наперад, у выніку чаго паднялася палітычная актыўнасьць усіх слаёў насельніцтва.

Восьмы Ўсебеларускі Зьезд Саветаў склікаецца ў той момант, калі пытаньне аб падняцьці нашае сельскае гаспадаркі і прамысловасьці да даваеннага ўзроўню ўжо засталося ззаду. Калі сетка нашых культурна-асьветных і лекавых установ шмат перавысіла даваенную сетку. Калі балючае для буржуазных дзяржаў нацыянальнае пытаньне ў нас вырашана безбалюча, і нацыянальная палітыка праводзіцца правільна, пры поўным задавальненьні і падтрыманьні працоўных усіх нацыянальнасьцяў. У працы VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў новым, немалаважным момантам зьяўляецца яшчэ і тая акалічнасьць, што нядаўна мы мелі новае пашырэньне нашае рэспублікі, г. зн. далучэньне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў.

Ня гледзячы на буйныя дасягненьні ува ўсіх галінах нашага соцыялістычнага будаўніцтва, жыцьцё ў умовах сучаснасьці шпарка пасоўваецца наперад і вымагае ад працоўных нашае краіны, ад савецкай улады і комуністычнай партыі разьвязаньня ўсе новых і новых больш складаных і важных пытаньняў і задач. Наша сельская гаспадарка ня можа ўжо далей пасьпяхова разьвівацца і з спажывецкай пераходзіць на таварную без таго, каб ня ўзяць рашучага напрамку на культурнасьць, інтэнсіфікацыю, машынізацыю. А гэта не магчыма без пашырэньня і пераабсталяваньня нашае фабрычна-заводзкае прамысловасьці. Вось чаму комуністычная партыя і савецкая ўлада рашуча высунула цяпер лёзунг **індустрыялізацыі краіны**. І ажыцьцяўленьне гэтага лёзунгу для рабочых і сялян Савецкай Беларусі зьяўляецца ў сучасны момант аднэй з найвялікшых, першачарговых задач. З гэтае прычыны ў парадку дню VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў, побач з дакладам Народнага Камісарыяту Земляробства стаіць і даклад Вышэйшае Рады Народнай гаспадаркі. Гэтыя-ж самыя пытаньні сталі і ў парадку дню амаль што ня на ўсіх толькі што скончыўшыхся акруговых зьездах саветаў.

Не малаважным у сучасны момант зьяўляецца для нас і пытаньне народнай асьветы. І ў гэтай галіне мы ніякім чынам ня можам застанавіцца на тых дасягненьнях, якія маем цяпер.

Задачай сучаснага моманту зьяўляецца ня толькі пашырэньне сеткі школ і палепшаньне становішча іх, але і магчыма перагляд і ўдасканаленьне сыстэмы народнае асьветы, **і абхват школамі ўсяго дзіцячага насельніцтва**, г. зн. шчыльны падыход да вырашэньня пытаньня **аб абавязковым усеагульным навучаньні**. Гэтае жыцьцёвае пытаньне таксама стаіць у парадку дню VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Пытаньне аб **становішчы гарадоў**, якое пастаўлена ў парадак дню VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў, зьяўляецца ў сучасны момант асабліва вострым і балючым для рабочае клясы, калі жыльлёвы крызіс у нашых гарадох дасягнуў да нязвычайных разьмераў. Гэтае пытаньне патрабуе неадкладных мерапрыемстваў у сэнсе адбудовы гарадоў і паступовага зьнішчэньня жыльлёвага крызісу.

Вядома, што ў асяродку ўвагі VIII Усебеларускага Зьезду Саветаў будзе справаздачны даклад ураду, з якога працоўныя Савецкай Беларусі праз сваіх найлепшых прадстаўнікоў-дэлегатаў зьезду даведуюцца дакладна аб усім тым, што за апошнія два гады зроблена урадам БССР у сэнсе кіраваньня і рэгуляваньня ува ўсіх галінах жыцьця нашае краіны і якія ў далейшым мы маем перспэктывы ў гэтым напрамку.

Трэба падкрэсьліць яшчэ і тое, што Восьмы Ўсебеларускі Зьезд Саветаў склікаецца ў абставінах надзвычайнай напружанасьці міжнароднага становішча, калі з аднаго боку стары, аджываючы свой век імпэрыялізм з хцівасьцю дзікага зьвера імкнецца задушыць бурны ўздым рэволюцыйнага руху кітайскіх працоўных мас, з другога боку ўся міжнародная буржуазія стараецца зблёкавацца супроць Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік і парушыць нашу мірную працу па гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву, па пабудове соцыялізму. Маючы на ўвазе гэткую пагрозу, Зьезд вымушан будзе падкрэсьліць неабходнасьць прыняцьця ўсіх мер, якія-б маглі паставіць у найлепшае становішча нашу Чырвоную армію і яе абароназдольнасьць.

Будучы ўпэўнены ў тым, што наша Рабоча-Сялянская Чырвоная армія, а таксама і ўсе працоўныя Савецкіх Рэспублік, пры падтрыманьні працоўных усяго сьвету, змогуць у любы момант даць належны адпор усялякім варожым замахам на Савецкую краіну,— VIII Ўсебеларускі Зьезд Саветаў зможа спакойна, цьвёрда і па-ленінску вырашыць усе тыя пытаньні, якія перад ім стаяць і даць правільны напрамак у далейшай працы па соцыялістычным будаўніцтве ў нашай Савецкай краіне.

З. Чарнушэвіч.

Конфэрэнцыя УсеЛКСМ скончылася

У чацьвер 31-га сакавіка, 5-я Ўсесаюзная конфэрэнцыя УсеЛКСМ скончылася. Раніцою адбыўся даклад мандатнай камісіі.

На конфэрэнцыі прысутнічала 1893 дэлегатаў з пастаноўчым голасам і 267 з дарадчым.

Пасьля дакладу мандатнай камісіі, конфэрэнцыя прыняла рэзолюцыі па дакладам ЦК, расійскай дэлегацыі ў КІМ'е і інш., а потым заслухала заключнае слова **Тав. Чапліна**.

„Я выказваю ўпэўненасьць—сказаў т. Чаплін,—што ўсе нашы рэзолюцыі будуць праверацца з пункту погляду іх выкананьня. Пасьля конфэрэнцыі мы з павялічанай энэргіяй возьмемся за выкананьне ўсіх стаячых перад намі задач. Залогам таго, што мы з гэтымі задачамі справімся, зьяўляецца кіраўніцтва нашай партыі і ўся гісторыя нашага Саюзу, якая кажа аб тым, што ва ўсіх этапах разьвіцьця нашай рэволюцыі Комсамол ішоў у першых шэрагах і зьяўляўся актыўным памочнікам партыі!

Комсамольцы-кітайцы, дэлегаты конфэрэнцыі.

Артылерыйская падрыхтоўка імпэрыялістых.

Падзеі ў Кітаі.

У разьвіцьці Кітайскай рэволюцыі зараз наступіў пераломны момант. Заняцьцем Шанхаю і Нанкіну канчаецца першы пэрыод барацьбы. У руках рэволюцыі зараз знаходзіцца амаль палова Кітаю і пры тым тая частка, дзе пролетарыят сконцэнтраваны ў вялізныя, шматтысячныя масы.

Заняцьце Шанхаю замацоўвае для рэволюцыі амаль усю раку Ян-Цзы—гэты важнейшы гандлёвы шлях, які ўваходзіць далёка ў глыб Кітаю—амаль усе гандлёва-прамысловыя цэнтры краіны і крыніцы больш, чым палова мытных прыбыткаў.

Зараз нацыянальна-рэволюцыйны ўрад фактычна робіцца агульна-кітайскім урадам, без яго удзелу ня можа быць вырашана ніводнае больш менш важнае пытаньне, якое нават закранае інтарэсы тых тэрыторый, якія нават і не ўваходзяць у склад занятых кантонцамі. Гэта разумее нават і Чжан-Цзо-Лін, які прымушан таксама загаварыць аб «нераўнапраўных дагаворах» і прыняць некаторыя захады каб абмежаваць правы і прывілеі чужаземцаў.

Аднак, зараз асноўнай і найбольш галоўнай сілай рэволюцыі зьяўляецца пролетарыят, вызвалены ад мілітарыстых. Рабочыя організацыі растуць і штодзень павялічваюцца. Гэты рост значна ўзмацняе становішча нацыянальна-рэволюцыйнага ўраду і адначасова павялічвае пролетарскі ўплыў на ўрад.

З другога боку—кітайская буржуазія Шанхаю, якая вітала а часам, садзейнічала перамозе нацыянальна-рэволюцыйнага войска, бязумоўна супроць узмацненьня пролетарскага ўплыву ва ўрадзе,—яна бязумоўна будзе супроць гэтага **змагацца**.

Становішча яшчэ ўскладняецца тым, што зараз рэволюцыя шчыльна надышла да разьвязаньня пытаньня адносна узаемаадносін з сусьветным імпэрыялізмам, які добра разумее, што яго панаваньню нанесен моцны і сьмяртэльны ўдар, які можа яго цалком выкінуць з Кітаю. Перад гэтай пагрозай магчыма, што ўсе імпэрыялістыя створаць адзіны фронт супроць рэволюцыйнага ўраду. Бамбадыроўка Нанкіну суднамі ангельска-амэрыканскага флёту зьяўляецца першай спробай сумеснай барацьбы Англіі і Амэрыкі супроць кітайскай рэволюцыі. Зусім магчыма, што і ў далейшым будзе створаны аб'яднаны фронт Англіі, Амэрыкі і Японіі ў Кітаі.

Гэта значыць, што вайна імпэрыялістых ў Кітаі можа распачацца, што «ставіць пад пагрозу гармат усе заваёвы кітайскай рэволюцыі. Сусьветны пролетарыят, які зараз разгортвае кампанію падтрыманьня кітайскіх працоўных, зьяўляецца той выключнай сілай, якая адсячэ руку, якая занесена над рэволюцыяй.

Албанскае пытаньне.

Імпэрыялізм шукае прычыну распачаць вайну. Ён мацуе зараз глебу ў Кітаі. Ня менш ваенай небясьпекі мы зараз маем ў Албаніі ў гэтай невялічкай дзяржаве, якая знаходзіцца ў Заходняй частцы Балканскай паўвысцы. Для Італіі Албанія важна у экономічным сэнсе (нафта), а таксама і у політычныя. Албанскія горы вельмі удобны як пазыцыя для нападу на суседнія дзяржавы і ў першую чаргу на Паўднёва-Славію. Італьянскі імпэрыялізм, які хоча захапіць Албанію, уступае ў востры конфлікт Паўднёва Славіяй. Апрача гэтага, Албанскія парты забясьпечваюць панаваньне Італіі на Адрыятычным моры, —якое ляжыць паміж Італіяй з аднаго боку і Албаніяй і Паўднёва-Славіяй—з другога.

Італія паслала ў Албанію сваіх афіцэраў, што выклікала вялікае нездаволеньне ў Паўднёва-Славіі. Італія адказала на гэта грознай нотай. Конфлікт перашоў ў становішча, калі з мінуту на мінуту чакалі пачатку вайны. Гэтак аднак пакуль ня здарылася. Паўднёва-Славія адступіла, таму, што Італія забясьпечыла сабе падтрыманьне Англіі, а Францыя, якая звычайна падтрымлівала Паўднёва-Славію на гэты раз ад гэтага устрымалася.

Гэткім парадкам карыстаючыся тым, што ўвага ўсяго сьвету згуртавана на Кітайскія справы, Італія рыхтуе вайну ў Эўропе. Паўднёва-Славія зараз адступіла для таго, каб, карыстаючыся лепшым момантам, зноў уступіць ў барацьбу з Італьянскім фашызмам.

Спрэчкі ў нямецкім парляманце

Вельмі цікавыя для нас спрэчкі, якія нядаўна былі ў нямецкім рэйхстагу адносна пастаноў апошняй сэсіі Лігі нацый. Як ведала галоўнае пытаньне адносна эвакуацыі Францускага войска з займаемых ім нямецкіх провінцый,—на гэтай сэсіі ня было вырашана.

Адсрочка вырашэньня гэтага пытаньня да ліпеня тлумачыцца тым, што Англія гэтым хоча паказаць Нямеччыне, што разьвязаньне гэтага пытаньня залежыць ад яе і таму за пэўную ўплату яна гэта зробіць. Нямеччына павінна заплаціць пагоршаньнем сваіх узаемаадносін з СССР, адмаўленьнем ад водпуску нам крэдытаў і паслабленьнем Савецка-нямецкай дзейнасьці.

Спрэчкі ў рэйхстагу (парляманце) паказалі, што Нямеччына хістаецца ў гэтым пытаньні. Як і заўжды соцыял-дэмократы (меньшавікі) ратавалі адмовіць СССР у крэдытах. Але цікава тое, што нават міністар замежных спраў Штрэзэман і той хоць і асьцярожна выступіў супроць СССР. Агульны вынік: сусьветны імпэрыялізм не чале якога стаіць Англія і зараз робіць усё магчымае каб зьнішчыць усе рэволюцыйныя заваёвы.

Пролетарыят СССР упарта і ўпэўнена будуе соцыялізм і, ня гледзячы на ўсякія перашкоды, дасягне сваёй мэты.

Працоўныя масы Кітаю, атрымаўшы дапамогу сусьветнага пролетарыяту, давядуць Кітайскую рэволюцыю да пераможнага канца.

Пасьля Нанкінскіх расстрэлаў.

На творчы рэволюцыйны шлях.

Два моманты выклікалі такую шпарку перамогу кантонцаў: падтрыманьне і садзейнічаньне шырокіх сялянскіх мас і дробнай буржуазіі з аднаго боку, організаваны напор, актыўнасьць і ініцыятыўнасьць кітайскага пролетарыяту. Дзякуючы падтрыманьню сялянства кантонцы зьнішчылі ворага. Рэволюцыйная рашучасьць маладога кітайскага пролетарыяту разбурыла ўвесь тыл ворагаў рэволюцыі.

Зараз нацыянальна-рэволюцыйны рух увашоў у новую паласу свайго развою.

Апошнія перамогі адзначаюць, што недалёкі час, калі ідэя аб нацыянальным аб'яднаньні Кітаю ў адну рэволюцыйную дзяржаву—ажыцьцёвіцца.

Бяз музыкі.

Раптам мы заўважылі іх адсутнасьць. Мы шчыра спрабавалі шукаць традыцыйныя іх фігуры. Іх ня было відаць ні на прывычным месцы, ні за калосьнікамі, сярод мёртвай пышнасьці тэатральнага рэквізыту, ні на галёрцы. Мы ня ўбачылі іх бліскаючых лысін, іх апухлых шчок, надуваючых фаготы, ні сьветлай медзі труб, ні гатовых узьляцець смычкоў, ні хвалістых абрысаў скрыпак. Музыкантаў абсалютна ня было ў тэатры Эрмітажу. Конфэрэнцыя адчынілася бяз музыкі.

Гісторыі комсамольскіх зьездаў і конфэрэнцый наўрад ці памятаюць адчыненьне бяз музыкі. Традыцыйныя тушы і страфы гімнаў нязьменна праводзілі іх з гучнай і пышнай даньню. Яшчэ ў мінулым годзе ў залі 7-га зьезду зьвінелі акадэмічныя галасы оркэстрантаў Вялікага Тэатру. А зараз—ніводнага музыканта.

Конфэрэнцыя бяз музыкі! Ня чутна бурчаньне віолёнчэлі, ні дрынчэньні медных талерак, ні ўздыханьня габоеў, ні шопату флейт, якія зьліваюцца ў сагласны гром. Конфэрэнцыя бяз музыкі?

І ўсё такі на ўрачыстым пасядженьні 5-й конфэрэнцыі УсеЛКСМ была музыка. Вялічэзная, непараўнальная музыка—яна пранікала сабою ўвесь вечар, усе прамовы, усе выступленьні, усе ўзгалосы, усю залю. Натхненая, патэтычная, гэніяльная самая простая і самая складаная музыка захоплівала, залівала і хваляла конфэрэнцыю. Гэта была далёкая, але выразная музыка Кітаю, музыка патрасеньняў і бунтаў, ні з чым не параўнальная музыка рэволюцыі.

Яе смутны гром яшчэ задоўга да адчыненьня роялю ў паветры фойэ, сярод дэлегатаў і гасьцей. У комсамольскай мітусіне, перад адчыненьнем, больш усяго гаварылі аб Шанхаі і Кантоне, таксама, як гаварыла аб гэтым у той час, уся Масква, увесь Савецкі Саюз, увесь сьвет.

Першы музыкальны сказ з Кітайскай сонаты прагучэў у **Чапліна**. Яго першае прывітаньне, яго першыя словы былі адданы «слаўнай Кантонскай арміі і паўстаўшым гэроям Шанхаю». І конфэрэнцыя спаткала гэтыя словы адказнай музыкальнай хваляй, нясучай на гарачым грэбені сваім воплескі і ўзгалосы.

Але вось, ужо загучэлі трубы і фанфары. Трубачы Кантону зайгралі паход. Іх трубы гучэлі ў прамове шанхайскага комсамольца, які вітаў 5-ю конфэрэнцыю комсамолу. У гэтай адрывістай і поўнай скваснога ўнутранага полымя прамовы, гучэлі фанфары пераможнікаў Шанхаю, мінорна стагналі флейты шаньдунцаў і плакалі ў барах чужаземнага кварталу скрыпкі ангельцаў.

«Вы—з намі,—мы—з вамі! Мы ўзялі ў левую руку чырвоны сьцяг, а ў правую—стрэльбу»...

Маленькі чалавек у круглых акулярах гаворыць аб тым, што кітайскаму комсамолу неабходны вопыт усесаюзнага Комсамолу. Ён кончыў заклікам да перамогі над Пекінам. Гэта прагучэла зусім, як «Даёш Пекін».

Конфэрэнцыя бяз музыкі! Хіба можна перадаць нечаканую, капрызную, лёгічную і зьвілістую музыку падзей, урачыстую музыку мас, перажываючых са сьлязьмі, радасьцю і кроўю цудоўную моладасьць паўстаньняў? «Шостае», інтэрнацыялістычнае пачуцьцё, якое органічна ўласьціва кожнаму бальшавіку, паведамляся маладым бальшавіком і ўмацоўвалася ў іх у гэтай залі.

Пасьля Іе-Чана бурную сонату Кітаю прадаўжаў тав. Косьсіор, сакратар ЦК партыі.

Свой даклад ён пачаў, як заўсёды, са слова «таварышы». Другое слова было «Нанкін». Трэцяе—«Узят». Чацьвёртае ён не пасьпеў сказаць, бо яго перарвалі нямысьлімыя воплескі.

Нанкін узят! Аб гэтым павядаміў конфэрэнцыі тав. Косьсіор. Першыя трубачы, увашоўшы ў Нанкін, выразна іграюць перамогу. Конфэрэнцыя бяз музыкі?

Ніякаму оркэстру ні зраўняцца з гэтай музыкай, якою была напоўнена заля Эрмітажу ў вечар адчыненьня Пятай Усесаюзнай Конфэрэнцыі Комсамолу. Гэтая музыка, якая нясецца з Ўсходу, падварочвала да сэрца і хвалявала думку і пачуцьці, як не магла-б хваляваць ігра віртуозаў усяго сьвету, сабраных разам. У ёй шумеў узьнёслы гнеў і гнеўнае захапленьне мас, і хваляваліся ў паветры маладыя сьцягі, надобныя на адкрытнасьць. І ў гэтым складаным хору рэволюцыйных інструмантаў ня чулася больш гучнага інструманту, чым труба. Гэта быў яе гістарычны чарод, яе неподзельная ўлада, і да яе далёкай песьні чутка прыслухоўваліся дэлегаты.

Пятая Конфэрэнцыя Комсамолу адчынілася бяз музыкі.

Тур.

Зярнё--чыста, плужок--новы...

Жывём справай, а ня словам.

Што кажуць нарады комсамольцаў—гаспадароў?

Як мы рыхтуемся

(Нарада комсамольцаў самастойных гаспадароў Смалявіцкай організацыі, Меншчына).

Мэтаю правядзеньня нарады было падрыхтавацца да пасяўной кампаніі. На нарадзе аднагалосна пастанавілі ачысьціць сваё збожжа перад сяўбой, а таксама і агітаваць сярод насельніцтва за ачыстку насеньня.

Некаторыя комсамольцы зімой займаліся ў сельска-гаспадарчых гуртках; нарада ўхваліла не абмяжавацца кніжнымі ведамі, а закласьці вясной вопытныя вучасткі, каб на практыцы кожны ўбачыў карысьць штучнага ўгнаеньня, пасеву адсартыраваным насеньнем, уплыў на ўраджай лубіну і г. д.

Вясною неабходна падумаць аб тым, каб увесьці, паколькі маецца магчымасьць, шматпольле на сваіх гаспадарках. Пабольш засеяць кораньплодаў і культурных траў.

Вось комсамолец Жодзінскай ячэйкі, Лучонак, ужо пераводзіць сваю гаспадарку на шматпольле.

Удзельнікі нарады дзяліліся вопытам у вядзеньні сваіх гаспадарак. «Я,—кажа к—лец Перальман—аднаго разу засеяў гоні сорным аўсом, дык што-ж?—і насеньня не сабраў. Цяпер я ўсё насеньне, што высяваю, чышчу, стараюся добра выпрацаваць зямлю, добра ўгнойваю, і таму мая палоска заўсёды выдзяляецца ад суседніх. Я заваяваў гэтым аўторытэт сярод сялянства, да мяне нават зьвяртаюцца за парадамі».

Разьвядзеньне добрай жывёлы таксама займае вялікае месца ў справе паляпшэньня гаспадаркі. Нашы комсамольцы бяруцца і за гэтую галіну працы.

Амільянаўская ячэйка ЛКСМБ праводзіць працу сярод сялян вёскі Ізьбіцкае аб колектыўнай закупцы племяннога быка, гэта праца будзе выканана.

Комсамолец Перальман завёў 2-х коняй добрай пароды, дзякуючы чаму ён добра апрацоўвае сваю зямлю (мае 5³/₄ дзес.—пяціпольны севаабарот) і ўраджай жыта ён сабраў 100—105 пудоў з дзесяціны.

З інформацый другіх таварышоў можна бачыць, што яны знаходзяцца ў дрэнных умовах, некаторыя з іх—пасялкоўцы яшчэ толькі абжываюцца; некаторым перашкаджае празпалосіцца ўвесьці ў сваю гаспадарку шматпольле. Але—усё-ж па магчымасьці ўводзяць культуры.

— Пасеяў я кармовых буракоў,—кажа комсамолец з в. Забалоцьце Папковіч—аглядаў іх. Але яны якраз расьлі сярод жытных палосак, зжалі жыта суседзі і покуль я агледзіўся, стравілі ўсе мае буракі.

Але хлапец не адчайваецца. «Другі раз пасею у лепшым месцы. А суседзяў таксама буду наталкваць каб уводзілі кармовыя буракі».

Комсамольцы-гаспадары аднагалосна заявілі:—**нікому ня сеяць нячышчаным насеньнем.**

Янка Пятроўскі.

Нарада самастойных гаспадароў Смалявіцкага раёну.

Поплаў можа даць многа сена

Распрацоўка паплавоў

Паднімаць дзёран трэба з восені на глыбіню 4-5 вяршкоў. Калі пласты ня шчыльна прыляглі, то трэба прыцісьнуць катком (вальцам). Вясною гэтая ральля распрацоўваецца талерачнаю бараною, або пружынаю, а калі ёсьць на пункце, то адмысловымі лапчатымі баронамі.

Пасеў траў

Пасьля гэтага можна сеяць. Першы год высяваюць мешанку вікі, пялюшкі і аўсу. Па разьліку на дзесяціну—вікі 4 пуды, палюшкі 3 пуды і аўсу 8 пудоў. Калі няма палюшкі, то яе замяняюць вікай. Другі год частка займаецца ільном або бульбай, або зкоў віка—аўсянай зьмесьсю на корм. К трэцяму году прыступаюць да ўгнаеньня поплаву і пасеву мешанкі паплаўных траў. На дзесяціну кладуць 33-36 п. томашлаку, або 18-24 пуды калійнай солі. У залежнасьці ад глебы, выбіраюць адну з двух гэтых мешанак.

А сеюць вось якую мешанку:

Назва травы	Для сухіх паплавоў (сухадолаў)	Для сырых поплаваў (нізкіх)
Канюшына чырвоная	15 ф.	5 ф.
Канюшына Шведак.	—	10 „
Канюшына белая .	5 ф.	3 „
Цімафэйка	15 „	10 „
Касьцяр бязосты .	20 „	10 „
Аўсяніцы лугавое .	12 „	21 „
Мятліцы лугавое .	6 „	8 „
Яжы	8 „	6 „
Лісахвосту	—	8 „
Палевіцы белае . .	—	4 „
Аўсяніцы чырвонае	—	4 „
Пырніку	4 „	—

Пакрыўныя расьліны

Сеюць яшчэ авёс 5-6 пудоў на дзесяціну і забараноўваецца звычайнаю бараною. Пасьля баранаваньня аўса сеюць зьмесь траў. Спачатку высяваюць насеньне яжы, аўсяніцы, лісахвосту, а другі раз высяваецца насеньне больш лёгкае—канюшына, цімафейка, палявіца. Гэта ўсё ёсьць, так званыя пакрыўныя расьліны. Яны зьнімаюцца толькі на зялёны корм.

Касіць іх трэба на 3-4 вяршкі ад зямлі. Пасьля зьняцьця пакрыўнага пасеву сеяныя травы разьвіваюцца так што к восені іх можна касіць.

Г. Пятроўскі.

На перавыбарах бюро ячэек.

Грош нам цана,

калі мы толькі гаворым аб „формах і мэтодах" і не ўзяліся закасаўшы рукавы за практычную справу.

З перасоўкай па ячэйкам

Газэту—у штодзённую працу ячэек!..

(Менск, Гар. раён)

Наша праца ня прыстасована да запрабаваньняў моладзі, у нас дрэнна праходзяць сходы ячэек, слаба пастаўлена наогул масавая праца, мы яшчэ ня можам разьмяркоўваць абавязкі паміж комсамольцамі раўнамерна (ці моцная перагрузка, ці зусім няма яе), слаба кіраўніцтва вылучанымі на тую, ці іншую працу.

Часта у нас бывае так: райком ня прыслаў цыркуляраў, значыць і праводзіць нічога ня трэба. Сваёй ініцыятывы мала. Між тым зараз шмат ячэек ажывілі сваю працу:

Прыдумваюць, новыя цікавыя мерапрыемствы. Гэтыя кавалачкі вопыту захоўваюць і складаюць нашы газэты. Вось распаўсюджваць гэты вопыт і ўзялася камісія па друку Гарраёну, зрабіўшы нявялікую перасоўку ў справаздачную кампанію перавыбараў бюро ячэек.

Цэнтр перасоўкі 2 плякаты.

Па большасьці пытаньняў комсамольскай працы зроблены выразкі з газэт, на прыклад: масавая праца, нататкі з «Чырвонай Зьмены», аб політ-вайне, вытворчасьць, аб вечары маладых друкароў у Менску, нагрузка, артыкулы з «Комсам. Праўды» і г. д.

Выразкі разьмяркоўваюцца па аддзелам, апранутыся ў прыгожыя рамачкі. Некалькі малюнкаў. 7—8 лёзунгаў аб газэце. Вось і уся перасоўка. Найсьці парашылі ў рабочую ячэйку на завод «Варшавянка».

Першы блін комам

З лёзунгамі і плякатамі селі ў конку.

Затарахцела конка... Задрыжэла на некалькі ладаў шкло ў вокнах... Замільгацелі брудныя вуліцы, шэранькія будынкі і хаткі...

— Стоп! Перасадка. Выходзьце.

Пералічыўшы сваіх пасажыраў як куранятак, павеў нас кандуктар праз брудны дворык у другі вагон.

— Мост праз Сьвіслач будуецца. Таму і перасадка.

Хутка ўжо і «Варшавянка». Прабылтаўшы некалькі вуліц, спазьніліся на сход ячэйкі.

Перасоўкі разьвесілі, але хлопцы прачытаць ня мелі магчымасьці, бо сход ішоў.

У гэтым першая памылка. Трэ'было разьвесіць раней за два дні.

Але ўсё-ж настаялі, каб ка[illegible] распрацоўцы пляну узяла мат[illegible] расоўкі, бо ячэйка слабая, праца [illegible] махровы тыпічны «актывісты» старшыня Апа «дае дырэктывы і пляны»... але сам нічога ня робіць.

Ячэйцы трэба скарыстаць, ар[illegible] з перасоўкі аб конкрэтным кі[illegible]тве. Перасоўку пакінулі на два дні.

„Мы перарасьлі"

Ячэйка Наркампрацы.

Справаздача бюро... Як належыць...

— Праца наладжваецца. Сувязь тр[illegible] маем. Адным словам усё добра...

А з спрэчак вызначалася, што ячэйка ня спаяна, хлопцы сходамі ня цікавяцца, позьняцца, уходзяць. Газэт комсамольскіх выпісваюць 50 проц. усёй ячэйкі.

Запыталі:

— «Чаму-б вам не скарыстаць вопыт Слуцкай ячэйкі Соўгандльслужачых. наконт вытворчага вечару?

— Бачыце, цыркулярчыка ня было...

А другі сябра бюро ляпнуў:

— Мы дрэннага вопыту ня хочам браць.

У нас усё добра!

Потым другі «актывісты».

— Ды чаго вы прыходзіце агітаваць. Пастаўце асобны даклад. Пастановім. Вы пішам. І усе. Мы «Чырвоную Зьмену» перарасьлі, яна нас ня цікавіць.

А вось плоды пераростку. З 16 выкліканых у Апа на праверку ведаюць добра 4. Сходы ячэйкі мёртвыя.

Усё-ж такі ўвесь сход падтрымаў нас. Выступалі асобныя комсамольцы з прапановамі, каб абгаварваць на сходах матар'ял з «Чырвонай Зьмены» і «Комсом. Праўды».

Урэшце прынялі нашыя прапановы:

1. Каб організаваць вытворчы вечар.
2. Правесьці сход ячэйкі, без дакладчыка.
3. Абгаварыць пытаньне аб этыцы.
4. Зрабіць дошку табель-нагрузцы.

З гэтага першага кроку вызначылася што—перасоўка патрэбна ячэйкам, яна прыцягвае газэту да гушчаў моладзі.

І цікава пры гэтым адзначыць, што радавыя комсамольцы перасоўкай цікавяцца, а вось актыў, яшчэ супярэчыцца, чакае цыркуляраў.

Алесь Каліта.

Няма магчымасьці займацца.

Эх, перамідачкі!

На карабельным сьвяце падшэфнага

Якім павінна быць наша шэфства?

Раніцай у суботу 19-га сакавіка пасьля досыць вясёлай начоўкі на проках, дэлегацыі пашлі зноў на лінкор і „разьмясьціліся" па кубрыках падшэфных рот. Праўда, Менская дэлегацыя толькі прышла, разьвіталася з некаторымі чырвонафлёццамі 6-й роты і не дачакаўшыся карабельнага сходу паімчалася ў Ленінград.

Бабруйская дэлегацыя, мабыць па абмылцы, папала ня ў трэцюю роту, а ў сёмую—падшэфную Барысаўскай акруговай організацыі.

У 16-ым кубрыку гэтай роты над ленінскім сталом вісіць чырвонае палатно з такім надпісам:

— «Кубрику № 16 линкора «Парижской Коммуны» ў дзень 18-га сакавика ад шэфа Барысаўскай Акруговай організацыі ЛКСМБ».

Пятрусь—беларус па паходжаньню, любімец карабля,—ведаючы, што ў беларускай мове пасьля „р" „і" ніколі ня пішацца і што беларускі правапіс мае сваё „і", падышоў да мянеі з ухмылкай прагаварыў:

— Напісана на шэфскай мове... пачатак рускі, а канчатак—беларускі...

Ня ведаю, як адчувала сябе пасьля такіх слоў марака Барысаўская дэлегацыя, якая ў гэты час была тут.

Ёсьць інструманты—знашліся і музыкі.

Лепш за ўсіх падрыхтавалася да паездкі на падшэфны лінкор Бабруйская організацыя. Гэта відаць, папершае, з колькасьці дэлегацыі, выбарнасьці яе на фабрыках, заводах, у раёнах, што, бязумоўна, мае вялікае політычнае значэньне, і падругое—прывезеныя падарункі.

Бабруйск прывёз падарункаў ня менш, як на тысячу рублёў. З больш дарагіх трэба адзначыць: два гармонікі, новенькі грамафон, гітары, балалайкі, мандаліны, бібліотэка на сто рублёў і інш.

Як разьвязалі падарункі і музычныя інструманты сваім піскам далі сябе адчуць, маракі яшчэ больш ажыўлена забегалі з кубрыка ў кубрык.

— Петь, а Петь, где Ванюха?—Нёсься з верху колас у 12-ты кубрык.

— А зачем тебе он?

— Беларусы гармошки привезли... играть будем!

— Гармошки говоришь?—абазваўся Ваня з кутка кубрыку і куляй пусьціўся на верх, адстукваючы па жалезных сходах рытмы „Казачка".

І гарманісты узяліся за гармонікі, гітарысты—за гітары, мандалісты—за мандаліны, балалаечнікі—за балалайкі, а хто іграць на гэтых інструментах ня ўмее—весела накручвае грамафон паставіўшы пласцінку Дзям'яна Беднага—„Папоўскае".

На буфэтнай палубе плясуны пусьціліся ў прысядку.

Усё радавалася. Чорненькія стужкі ад шапак маракоў то разьвіваліся ў паветры, то закручваліся вакол шыі. Грукатаньне венцыляатараў заглушалася здаровым і радасным вясельлем.

Бялявы нізкарослы ўкраінец Павло,—найлепшы плясун на лінкоры, зьвярнуўшыся з вахты мігам умыўся, пераапрануўся і на палубу, дзе гармонік і радасьць.

Карабельны сход пра наша шэфства.

У абгаварэньні працы Комсамолу Беларусі, асабліва ў галіне ваенізацыі і шэфства, маракі прынялі актыўны ўдзел.

Тав. Кузьняцоў—комсамольскі „аторг" кажа:

— Трэба пасіліць ваенізацыю комсамолу Беларусі. У гэтым напрамку некаторыя акругі маюць вопыт, але ён не распаўсюджан па ўсяму Саюзу.

У шэфскай працы над нашым лінкорам адчуваецца значны зрух у лепшы бок.

Вядома, ёсьць яшчэ шмат і недахопаў.

Напрыклад, лінкор атрымоўвае з Беларусі 15 экземпляраў яўрэйскіх газэт, а сярод нашых маракоў няма ніводнага чалавека, які-б разумеў яўрэйскую мову.

У Воршы сакратар коопэратыўнай комсамольскай ячэйкі нават ня ведае, як завецца падшэфны лінкор. І такіх фактаў—колькі хочаце.

Брошура Курціка—„Парыская Комуна"—добра выдадзена і адыграе вялікую ролю ў справе азнаямленьня беларускай моладзі з сваім падшэфнікам.

У апошнія месяцы газэта „Чырвоная Зьмена" пачала зьвяртаць на наша жыцьцё вялікую ўвагу, што можна лічыць прычынаю палепшаньня і самога шэфства.

— Акругі,—кажа карабельны упаўнаважаны па шэфству тав. Плыкін,—ня трымаюць з намі цеснай сувязі. У далейшым трэба лінкору пасылаць у акругі весткі аб ходзе шэфства, што дасьць магчымасьць камітэтам комсамолу „паднажымаць" на ячэйкі і на раёны. Наведаньне карабля комсамольцамі-шэфамі, а маракамі—Беларусі трэба зрабіць ня толькі сьвяточнымі, а гэта мерапрыемствы жывой сувязі практыкаваць рэгулярна.

Шэфства палепшылася,

—кажа камісар лінкору тав. Настусевіч.— У далейшым трэба сёньняшнія дасягненьні замацаваць і пашырыць.

Мне перадавалі, што над шостай ротай трымаюць шэфства дзьве моцныя акругі—Менская і Гомельская. Мы хутка сябе перагледзім і недахопы зьнішчым.

Прывезеныя падаркі дэлегацыі перадаюць ротам за выключэньнем такіх рэчаў, як музыкальныя інструманты і бібліотэчкі. Апрача гэтага, вядомы процант будзе ісьці ў агульна-карабельны фонд.

У якасьці падарункаў мы чакаем ад шэфаў: літаратуры, канцылярскіх прыладаў і грошай. Іншыя гаспадарчыя рэчы нам не патрэбны.

Лінкор у лятучках.

Калі тав. Настусевіч скончыў сваю прамову, Бабруйская дэлегацыя выхапіла з кішэнь раней падрыхтаваныя лятучкі і пад гучныя воплескі пачала пускаць у маракоў.

Маленькія паперкі з надпісам: Привет славным бойцам Красного флота от раб.-крест. молодежи Бобруйщины! Ещё большее укрепление шефства над флотом—наша основная задача! і інш. матылькамі мітусіліся над галовамі маракоў.

Пасьля карабельнага сходу адбыліся ротныя нарады і фотографічныя здымкі на верхняй палубе лінкору.

К вечару, пад моцныя выкрыкі маракоў з палубы: Почаще навещайте!—Мы пакінулі лінкор.

Зьм. Паваротны.

Сумныя мы людзі... Сумныя нашы сходы...

(Менск, ячэйка Аб'яднанай профшколы мэталістаў).

Па справаздачы бюро ячэйкі ў спрэчках выступіла каля 15 чалавек. Актыўнасьць, як ніколі. Больш усяго застанаўліваліся аб нагрузцы і высоўваньні актыву.

Ёсьць напрыклад, у нашай ячэйцы такія комсамольцы, якія маюць па 3—4 нагрузкі. І выніку гэта дрэнна адбіваецца на вучобе хлапцоў. Наказ, які даў сход новаму складу бюро „раўнамерна нагружаць" усіх комсамольцаў.

Другое пытаньне, на якім застанавіліся гэта аб высоўваньні актыву.

Уся грамадзкая праца была ўзложана на трэцягоднікаў, а цяпер калі яны ўходзяць у выпуск,—дык некаму выконваць працу.

Актыў павінен быў выдзяляцца не перад выбарамі, а ў працягу ўсяго часу.

Сходы нашых комсамольскіх ячэек у працягу ўсяго часу праводзяцца па „шаблёну".

Сухі даклад чытаньне протоколаў бюро ячэйкі і на ўсім гэтым сход канчаецца. Усё гэта ўжо надта прыелася моладзі. Мы павінны падумаць аб тым, [illegible]ым ажывіць нашы сходы. Чаму-бы, напрыклад, замест дакладу не зрабіць „політтыр", або выпусьціць „політрулетку"?

Апа нашай ячэйцы ўжо організоўвае політтыр. Гэта дасьць магчымасьць выявіць політузровень нашых комсамольцаў і зацікавіць газэтай.

Леў Кацовіч.

Скарыстаем сонца, паветра і ваду!

Лета—самая лепшая пара году дзеля аздараўленьня моладзі.

Комсамольская ячэйка павінна непасрэдна кіраваць працай фізкультгуртка.

Будзем падрыхтаванымі.

Як рыхтавацца. Зьмест працы. Праца гурткоў.

Лета звычайна зьяўляецца часам ін[illegible]ай працы па фізкультуры. Павя[illegible] колькасьць гурткоў, павяліч[illegible] фізкультурнікаў, але да гэта[illegible] праца ў летні пэрыод ня мела

Намесьнік Старшыні ВСФКБ тав. Леў.

паглыбленага зьместу і гэта не дапамагала замацаваць усе дасягненьні на будучы час.

Асноўнымі задачамі на бліжэйшы летні пэрыод у гэтым годзе павінны быць: **конкрэтнае кіраўніцтва ростам гурткоў і лікам сяброў у іх, стварэньнем умоў для працы, дапамагаючых ахопу стыхійнага росту і правільнаму зьместу працы, паглыбленьне працы гурткоў, разьвіцьцё масавых форм фізкультуры і г. д.**

Як рыхтавацца.

Уся падрыхтоўчая праца да летняга пэрыоду павінна выказвацца ў популярызацыі зьместу форм і мэтодаў летняй працы ў масах фізкультурнікаў. Трэба падрыхтаваць кадр працаўнікоў па фізкультуры, дзеля чаго неабходны каротка-тэрміновыя курсы наміструктараў. Трэба забясьпечыць матар'яльнымі сродкамі для абсталяваньня спортпляцовак, набыцьця інвэнтару, прыцягваючы да гэтай працы зацікаўленыя ведамствы і організацыі.

Да ўмоў Беларусі ў гэтым годзе трэба прыстасаваць вопыт правядзеньня курсаў організатараў масавай працы, групуючыся ў гэтым на комсамольскія ячэйкі і профсаюзы.

Своечасова падрыхтаваная програма заняткаў у гуртках, улетку і прыстасаваная да тыповых гурткоў і ўзрастному складу займаючыхся таксама—ёсьць бліжэйшая задача.

Трэба загадзьдзя распрацаваць каляндар міжгурткавых, раённых, ведамственных і ўсебеларускіх сьвятаў фізкультуры і ўжо загадзя пачаць падрыхтоўку.

Усе пытаньні аб летняй працы павінны быць дасканальна распрацованы інструктарамі і фізкультактывам.

Усю падрыхтоўчую працу трэба будзе праводзіць, улічваючы вопыт мінулых гадоў, каб у гэтым годзе не паўтараць памылкі мінулага.

Зьмест летняй працы.

Увесь зьмест летняй працы гурткоў павінен быць прыстасаваны да складу і ў асаблівасьці да цікавасьцяй займаючыхся. Для гэтага неабходна вывучэньне прад'яўляемых запатрабаваньняў фізкультурнікаў.

У гуртках.

Зьмест працы ў гуртках гораду павінен, прыкладна, азначацца:

У спорце: лёгкая атлётыка, плаваньне грэбля, стральба.

У гульнях: гандбол, футбол, ручны мяч, італьянская лапта, баскэтбол, тэніс, ватэрполо.

У гімнастыцы: прыкладныя практыкаваньні на мясцовасьць.

У экскурсіях: пехатой, на лодках і мяшаныя.

Выхаваўчая-ж праца можа праводзіцца па тэорэтычнаму абаснаваньню праводзімай працы, выхаваньню гігіенічных навыкаў, выпрацоўка маральных якасьцяў і спортыўнай этыкі.

Праца вясковага гуртку можа, прыкладна, складацца ў наступных фізпрактыкаваньнях:

У спорце: лёгкая атлётыка, плаваньне грэбля, барацьба.

У гульнях: рухавыя і спортыўныя ў залежнасьці ад мясцовых умоў.

У танцах: мясцовыя, народныя, перайманыя гарадзкія, але ўсе на вольным паветры.

У гімнастыцы: парадкавыя, вольныя, на прыладах, прыкладная і г. д.

Выхаваўчая праца таксама што і ў горадзе, але асаблівы націск трэба зрабіць на гігіенічны бок.

За апошні час пачынае разгортвацца рух турызму ў Беларусі, з гэтай прычыны неабходна будзе правесьці популярызацыю сутнасьці турызму сярод фізкультурнікаў і шырокіх мас працоўных шляхам пастаноўкі дакладаў на сходах.

Эльга.

Фізкультурнае лета.

Да пабудовы па новаму.

Да вынікаў нарады комсамольскіх працаўнікоў па фізкультуры.

З вялікай асьцярожнасьцю і сур'ёзнасьцю было абгаворана нарадай пытаньне аб новых формах у фізкультурным руху. Усе довады таварышоў і фактычна ўсё палажэньне рэчаў гаворыць за пераход на выбарнасьць, які абгаварваўся і дэбатыраваўся ня толькі ў нас, але і па ўсім СССР.

Якія-ж довады?

Першы—Саветы фізкультуры ня могуць пры ўжо разросшымся фізкультурным руху, як орган міжведамсьцвены, улічыць і задаволіць масы фізкультурнікаў. Фактычна Саветы фізкультуры зараз кіруюць толькі навукова-мэтодычнай часткаю фізкультурнай працы і ня могуць з гэтай прычыны быць гнуткімі і чуткімі ва ўсім сваім кіраўніцтве. Ня рэдка Саветы працуюць без удзелу асноўных прадстаўнікоў ведамстваў, з другога боку самі фізкультурнікі імкнучыся ўдзельнічаць ва ўсёй фізкультурнай працы, але гэтых магчымасьцяў пры існуючых формах кіраўніцтва ня маюць. Тут і зьяўляюцца асабістыя «ножніцы» паміж формамі кіраўніцтва і запатрабаваньнямі фізкультурнікаў.

Другі—ва ўсім фізкультурным руху мы маем цэлы шэраг адмоўных зьявішч.

У нас павольны тэмп росту за кошт дарослых рабочых і сялян.

У нас слабы рост за кошт рабочай моладзі. Мы ахапілі ўсяго 29 проц. усёй рабочай моладзі.

У нас слабая самадзейнасьць большасьці гурткоў і слабое вылучэньне радавых фізкультурнікаў на агульна-фізкультурнай працы.

У нас масавая праца настаўлена слаба.

Усе гэтыя недахопы і досыць вялікія ў большай сваёй частцы і маюць свае корані ў гэтых «ножніцах».

Нарада парашыла далучыцца да думкі нарады пры ЦК УЛКСМ па пытаньню аб пераходзе на дабраахвотнае таварыства з адзіным кіраўнічым цэнтрам. Аднак, нарада ўлічыла тыя небясьпекі і цяжкасьці пры правядзеньні ў жыцьцё гэтага мерапрыемства.

Ці павінны мы зараз адразу «з месца ў кар'ер» прыступіць да пераходу?—Не!

Пераход на новыя формы кіраўніцтва і працы будзе ня сёньня і ня заўтра. Небясьпека, што мы чакаючы пераходу закінем практычную працу—маецца. Аб гэтым нарада сказала, што да таго часу, покуль пытаньне канчаткова ня вырашыцца, ня можа быць і рэчы аб паслабленьні працы таксама і аб прыняцьці якіх небудзь організацыйных захадаў да пераходу.

Уся ўвага на бліжэйшы час павінна быць сгрупавана на выжыцьцё пры існуючых формах кіраўніцтва ўсіх нашых недахопаў.

Трэба наладзіць працу гурткоў так, каб яна здавальняла запатрабаваньні асобных узрасных груп фізкультурнікаў, інакш мы ніводнага дарослага рабочага ня будзем мець у гуртках.

Масавая праца павінна быць разгорнута шляхам паказальных выступленьняў, экскурсій, сьвятаў, гульняў, спаборніцтваў і г. д.

Трэба, як бы там ня было ўвязаць працу інструктара з усёй працай гуртка.

Пара ўжо расштурхаць нашы бюро гурткоў,—няхай робяць справаздачы перад выбаршчыкамі аб сваёй працы, няхай сходы гурткоў стануць рэгулярнымі.

У адносінах да вёскі вызначаны тры задачы.

Выявіць і організацыйна аформіць існуючыя спортгрупы ў гурткі фізкультуры, концэнтруючы іх працу пры нардамох, хатах-чытальнях.

Увагу да падрыхтоўкі вясковых працаўнікоў праз курсы, прыцягваючы дэмобілізаваных чырвонаармейцаў, комсклад і комсамольцаў да іх.

Вывучыць працу вясковага гуртка і віды спорту, цікавячыя моладзь.

Асаблівая ўвага была ўдзелена нарадай пытаньню аб кіраўніцтве комсамолу фізкультгуртком. Трэба адкрыта прызнацца—наша комсамольская ячэйка ня кіруе гэтай працай, часам ня цікавіцца ёю. Яшчэ існуе погляд на фізкультурніка і фізкультуру як на «бязьдзельніка» і як на «здавальненьне», не ўваходзячая ў задачы працы ячэек.

Змагацца, усялякім чынам, змагацца з такімі адносінамі да фізкультуры. Зараз **цэнтр цяжкасьці кіраўніцтва саюзу фізкультрухам пераносіцца на ячэйку ЛКСМБ.**

Ячэйка разам з хатай-чытальняй, клюбам, культкамісіяй, мясцкомам і фабкомам павінна спрыяць організацыі гурткоў фізкультуры, там дзе для гэтага ёсьць умовы. Памятаць пастановы пленуму ЦК УЛКСМ, што: **«Комсамольцы павінны быць у гуртку дысцыплініруючым, організуючым і накіроўваючым працай гуртка асяродкам».**

Л. Ч.

Хто як рыхтуецца да лета

Віцебск

25 красавіка распачнуць працу гарадзкія **курсы** па падрыхтоўцы наміструктароў і групаводаў. У канцы мая будуць праведзены **10-цідзённыя курсы** раённых інструктароў.

У працягу красавіка і пачатку мая па ўсіх раёнах акругі праводзяцца **двухдзённыя інструктыўныя нарады організатараў масавых гульняў** пры вясковых ячэйках ЛКСМБ і хатах-чытальнях.

Сумесна з таварыствам ратаваньня на водах і профсаюзамі прыступлена да абсталяваньня на рацэ Заходняй Дзьвіне **грабной станцыі**, а на рацэ Віцьбе—**плавальнай.**

Закончваецца абсталяваньне цэнтральнай гарадзкой пляцоўкі і **двух раённых дзіцячых пляцовак** у горадзе.

31 сакавіка адбылася нарада юнсэкцый клюбаў, бюро гурткоў фізкультуры і прадстаўнікоў ведамстваў па пытаньню **організацыі турызму.**

У працягу красавіка ў раёнах праводзяцца конфэрэнцыі фізкультурнікаў па пытаньням аб летняй працы.

Бабруйск

Для падрыхтоўкі вясковых і гарадзкіх інструктароў з 10-га красавіка адчыняюцца **трохтыднёвыя акруговыя курсы** на 20 чалавек.

Распачата падрыхтоўчая праца па пабудове **вадзяной станцыі** і абсталяваньню **спортпляцовак** у горадзе.

Комсамолам праведзена кампанія па **ажыўленьню працы райсаветаў** фізкультуры.

АСФК з таварыствам ТСА пабудуюць **гарадзкі цір.**

АСФК з таварыствам паляўнічых адчыняе **ваенна-спортыўны магазын.**

У канцы красавіка будзе праведзена гарадзкая конфэрэнцыя фізкультурнікаў, а потым **акруговы зьезд** фізкультурнікаў.

Да пачатку летняй працы праведзена абсьледваньне ўсіх гурткоў фізкультуры і перавыбарнай кампаніі **бюро гурткоў.**

Клімавічы

Пры саветах фізкультуры рэгулярна працуюць групы фізкультактыву для падрыхтоўкі **масавых організатараў** фізкультуры.

Усе раёны будуць мець **па спортпляцоўцы.**

На пленуме АСФК ужо абгаварвалася пытаньне аб падрыхтоўцы да лета.

Гомель

10-га красавіка адчыняецца пленум АСФК, дзе будзе стаяць пытаньне **аб летняй працы.**

15-га красавіка адбудзецца **конфэрэнцыя фізкультурнікаў** аб летняй працы.

У гэтым годзе будзе даабсталяваны **стадыён** і летнія **пляцоўкі** для фізкультурнікаў.

Будуецца **вадзяная станцыя** на рацэ Сож.

Ворша

На праведзенай нарадзе раённых працаўнікоў фізкультуры цэнтральным пытаньнем было—падрыхтоўка да лета.

Куплена **на 2.000 руб. спорт'інвэнтару.**

Ужо зарэгістравана **8** дарослых футбольных каманд, **21** баскэтбольная.

Пры організаванай **вадзяной станцыі** будуць сконцэнтраваны **50 лодак.**

Сярод масы фізкультурнікаў вядзецца праца па популярызацыі летніх відаў фізкультуры.

Праводзяцца перавыбары бюро фізкульт'ячэек. У красавіку будзе склікана гарадзкая конфэрэнцыя фізкультурнікаў.

Менск

АСФК праводзіцца сходы інструктароў і **фізкультактыву** па пытаньню аб падрыхтоўцы да лета.

Організавана **сэкцыя гульняў.**

У канцы красавіка адбудзецца пашыраны пленум АСФК з прадстаўнікамі ад раёнаў, дзе будзе абгаварвацца пытаньне аб падрыхтоўцы да лета.

Закуплены летні спорт'інвэнтар на **400 руб,**

На спортпляцоўцы «Профінтэрн» у гэтым годзе даабсталёўваецца бягавая дарожка, месца для гульняў і **будуць пастаўлены душы.**

На Кашарскім пляцы будзе абсталявана **вялікая спортпляцоўка.**

АСФК высоўвае перад Акрвыканкомам пытаньне аб выкарыстаньні пад **стадыён** пляцоўку іподрому.

Організуюцца **зборныя каманды па** футболу, баскэтболу і лёгкай атлётыцы.

50 процантаў фізкультурнікаў прашлі і праходзяць рэгулярна праз **антропомэтрычны габінэт АСФК.** Вызначана шэраг масавых мерапрыемстваў па фізкультуры: **спаборніцтвы, гуляньні і экскурсіі.**

Некаторыя гурткі організоўваюць свае футбольныя каманды.

Па ўсіх профсаюзных гуртках ідзе ўзмацнёная падрыхтоўка да **прыгатаваньня спорт'інвэнтару і гарнітураў** для фізкультурнікаў.

Полацак.

Падрыхтоўваецца пытаньне аб абсталяваньні ў горадзе **стадыёну і вадзяной станцыі.**

1-га мая будзе наладжана **масавае сьвята,** прысьвечанае да адчыненьня летняга сэзону.

У бліжэйшы час будзе праведзена спаборніцтва **на лепшага стралка—комсамольца.**

Будуць практыкавацца прымацаваньні гарадзкіх гурткоў фізкультуры да вясковых.

Створана **сэкцыя гульняў.**

Мозыр.

Закуплена спорт'інвэнтару на **600 руб.** для раёнаў.

Будзе організавана **вадзяная станцыя.**

Разам з ТСА і таварыствам паляўнічых будуецца агульна-гарадзкі **цір.**

Профсаюзы разам з АСФК пабудуюць агульна-гарадзкую **пляцоўку для фізкультурнікаў.**

Магілёў.

За кошт грамадзкіх работ у горадзе будзе абсталявана **пляцоўка.**

Будзе пабудавана грэбнаплавацельная **станцыя.**

К летнему пэрыоду ў раёнах будуць праведзены каротка-тэрміновыя **курсы вясковых працаўнікоў.** З 10-га красавіка адчыняюцца месячныя курсы раённых працаўнікоў.

Пры вучтэхкоме створаны сэкцыі **грабальна-плавацельная** і **ватэрполо.**

Рэчыца.

Склікаецца **конфэрэнцыя фізкультурнікаў** па пытаньню аб летняй працы.

Склікаюцца **курсы** вясковых працаўнікоў.

Да адчыненьня летняга сэзону будзе наладжана агульна-гарадзкая дэмонстрацыя фізкультурнікаў і шэраг таварыскіх матчаў на гарадзкой пляцоўцы.

Слуцак.

20-га красавіка пачнуць працаваць **месячныя курсы** наміструктароў.

Пабудавана некалькі **пляцовак.**

Праведзена нарада з прадстаўнікамі раёнаў, на якім ужо вызначаны **першыя спатканьні** гарадзкіх фізкультурнікаў з раёнамі.

Барысаў.

Па ўсіх раёнах райвыканкомамі адведзены дзялянкі на **спортпляцоўкі.**

У горадзе рэмонтуюцца старыя і будуць абсталяваны **2 новыя** пляцоўкі.

Абсталёўваецца **стралковы цір.**

Будзе пабудавана **вадзяная станцыя.**

Амаль усе профсаюзы сучасны момант **робяць лодкі.**

Закуплена спортыўнага інвэнтару на 1500 руб. Інвэнтар разьмяркоўваецца сярод усіх буйнейшых раёнаў.

Закончваюць працу курсы **наміструктароў.**

12-га красавіка на пленуме АСФК будзе стаяць пытаньне **аб пераходзе на летнюю працу.**

М. Тамарын.

Організуем вечары фізкультуры!

(Віцебск, юнсэкцыя працасьветы).

Нядаўна наша юнсэкцыя, наладзіла вялікі фізкультурны вечар. Мэта вечару—паказаць дасягненьні фізкультгуртку юнсэкцыі, агітацыя за фізкультуру і прыцягнуць да удзелу ў працы гуртка яшчэ не ахопленых гуртком сяброў юнсэкцыі.

У дзень вечару заля Віцебскага Дому Працасьветы была поўная. Тым, якія спазьніліся, прышлося глядзець стоючы.

Програма вечару складася з інформацыі фізкультурніка аб сваёй працы, інсцэніроўкі—якая паказала ўсю карысьць нашай фізкультуры і шкадлівасьць буржуазнага спорту, спортыўных выступленьняў, балету, маршыроўкі і г. д.

Пасьля афіцыйнае часткі былі праведзены пад кіраўніцтвам інструктара масавыя спортыўныя гульні.

Былі і недахопы. Так, напрыклад, чамусьці не адбыўся даклад доктара аб фізкультуры і «фізкультуры», спортгурток, які налічвае 120 асоб на сцэне паказаў толькі 20 фізкультурнікаў, слабая падрыхтоўка, але моладзь вечарам засталася задаволена. Гэтым вечарам фізкультгурток набыў ня мала новых сяброў у свае шэрагі.

Такія вечары трэба організаваць і другім фізкультгурткам моладзі. Гэта значна пашырыць шэрагі фізкультурнікаў і прыцягне ўвагу нашае думкі да **фізкультуры.**

М. Тамарын.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Конфэрэнцыя чытачоў „Чырвоная Зьмена“

Сакратарыят Менскага АК ЛКСМБ ухваліў склікаць конфэрэнцыю чытачоў „Чырвонай Зьмены“ 10 красавіка ў клюбе імя КІМ.

У парадку дню конфэрэнцыі стаіць даклад рэдакцыі і „Чырвонай Зьмены“.

Ці апраўдала сябе школа?

ЦК ЛКСМБ вылучыў камісію ў складзе т. т. Лівшыца, Башкевіч і прадстаўніка ад Галоўпрофасьветы для абсьледваньня Курасоўшчынскай **школы яўрэйскай сялянскай моладзі.**

Мэта абсьледваньня — выяўленьне далейшых перспэктыў школы. На Беларусі—гэта адзіная школа яўрэйскай сялянскай моладзі.

Інструктарскія групы

Менскі АК ЛКСМБ ухваліў утварыць пры Акругкоме інструктарскую групу. Аналёгічныя інструктарскія групы будуць організованы пры ўсіх райкомах.

Дзеля вопыту гэткія групы ўтвараюцца таксама пры ячэйках БДУ і МШГ МББ чыгункі.

Дапамагаць адзін другому!
Лягерныя піонэрскія зборы

Акцябрскі райком ЛКСМБ распачаў падрыхтоўку да організацыі піонэрскіх лягераў.

На пасяджэньні райбюро ЮП выяўлен шэраг недахопаў у лягернай кампаніі мінулага году: лягеры організоўваліся толькі ў тых атрадах, якія мелі грашовую базу. Райбюро ЮП Акцябрскага райкому комсамолу ўхваліла ў гэтым годзе організаваць **не атрадныя, а групавыя лягерныя зборы.**

Больш матар'яльна забясьпечаныя атрады будуць яднацца з атрадамі менш забясьпечанымі. Напрыклад: атрады банкаўскіх устаноў з завадзкімі атрадамі і г. д.

Райбюро ўжо разаслала матар'ялы ячэйкам аб падрыхтоўцы да лягераў.

Профнарада харчавікоў

У першай палове мая месяца склікаецца ўсебеларуская нарада прадстаўнікоў моладзі ў праўленьнях саюзу харчавікоў. Парадак дню нарады наступная:

1) Даклад ЦК саюзу.
2) Справаздача ЦП саюзу харчавікоў аб працы сярод моладзі.
3) Даклады з месц.
4) Аб вытворчым выхаваньні і броні.

Хутка перавыбары фабзаўкомаў

У бліжэйшым часе распачынаюцца перавыбары фабзаўмесцкомаў, якія абраны на 6-месячны тэрмін.

Эканомкамісія ЦК ЛКСМБ дала дырэктывы мясцом аб удзеле моладзі ў надыходзячых перавыбарах фабзаўкомаў.

Палепшыць становішча чыгуначнага вучнёўства.

Нядаўна сакратарыят ЦК ЛКСМБ заслухаў даклад прадстаўніка ЦКУсеЛКСМ у праўленьні МББЧ аб становішчы профтэхасьветы на чыгунцы.

Па дакладу сакратарыят ЦК прыняў рэзолюцыю, асноўныя пункты якой зводзяцца да наступнага:

Устанавіць больш сталую спэцыялізацыю школ, каб дабіцца падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы тых спэцыяльнасьцяй, у якіх зараз адчуваецца патрэба.

З мэтай утаненьня сабекаштоўнасьці вучняў і скарачэньня тэрміну навучаньня, лічыць патрэбным пераход Аршанскай, Віцебскай і Менскай школ вучнёўства на агульна-адукацыйную базу сямігодкі.

У мэтах правільнага праводзеньня нацполітыкі ў школах лічыць неабходным—выжыцьцё няўважлівых адносін з боку вучняў і пэдагогаў да беларусізацыі, з будучага навучальнага году перавесьці поўнасьцю выкладаньне агульна-адукацыйных прадметаў на беларускую мову, уцягнуць дзяцей рабочых нацменшасьцяй (яўрэяў, палякаў) у школы вучнёўства.

Лічыць неабходным стварэньне больш чулых адносін з боку адміністрацыі да вучняў школ і іх запатрабаваньняў.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу на палепшаньне быту вучняў, якія жывуць у агульных памяшканьнях і наладжаньня сярод іх культурна-асьветнай працы.

Школьная нарада

У чэрвені месяцы склікаецца ўсебеларуская нарада вячэрніх школ рабочай і сялянскай моладзі і школ павышанага тыпу з наступнай абвесткай дню:

1) становішча і задачы вячэрніх школ рабочай і сялянскай моладзі;
2) мэтоды работы і выкладваньня ў школах і
3) Даклады з мест.

На нарадзе будзе працаваць шэраг сэкцый па розным галінам.

А што—клюб працуе?

Галоўполітасьветы ў хуткім часе правядзе абсьледваньне рабочых клюбаў БССР. **У першую чаргу будуць абсьледаваны Менскія клюбы—**гарбароў, саўгандслужачых, электрыкаў і пажарнікаў.

Абсьледваньне будзе праводзіцца сіламі прадстаўнікоў Галоўполітасьветы, ЦСПСБ і ЦП адпаведных профсаюзаў.

„Гэроям лазьні“-гарачая лазьня.
Як часта „ражымяць“ і „зьніжаюць“.
На другім пленуме ЦКК партыі.

Адна хітрая ўстанова Барысаву парашыўшы з'экономіць узяла і... **зачыніла рабочую лазьню.** І, уладаючы, ці відаць, кароткай памяцьцю, вельмі хутка **павялічыла пэнсію сваім супрацоўнікам на 23 тысячы рублёў.**

Гэта завецца «рэжым экономіі».

Вясна прышла!

Астрашыцка-Гарадзецкі райвыканком пазайздросьціўшы фордаўскім мільярдам прадаў Рудмэталгандлю 2 лесапільныя рамы за **40 руб.** Рудмэталгандаль прадаў гэтыя рамы спрытнаму прыватніку за **400 руб.** Прадпрыемчывы прыватнік прадаў іх Менскаму Акрвыканкому (якому падведамсьцьвенны РВК) за **2600 руб.**

Гэта таксама завецца «рэжым экономіі»

Аб многіх такіх і ня толькі такіх фактах мы чулі на апошнім пленуме ЦКК партыі.

З такімі вось фактамі вельмі часта, на вялікі жаль, прыходзіцца сустракацца. І з гэтым прыходзіцца ўпарта змагацца.

Многа цікавых рэчаў расказаў у сваім дакладзе тав. **Бэнак.**

Таварныя біржы. Амаль што у кожнай акрузе існавала біржа; і калі РСІ пачала распрацоўваць пытаньне аб зачыненьні іх, на яе накінуліся, ёй перашкаджалі. Але ўсё-ж такі таварныя біржы праспакойна былі зачынены, і **дзяржава з'экономіла на гэтай справе 300 тысяч руб.**

Дзяржгандбел. Гэта шаноўная ўстанова зусім ня ведала, як перакладаюцца на савецкую мову словы «рэжым экономіі». **У Дзяржгандбеле на кожныя 7 чалавек быў загадчык.** Дзяржгандбел ні ў якім выпадку не хацеў скарачацца. Аднак скарачэньне праведзена. Зноў такі зусім бяехваробна **дзяржава з'экономіла 113 тысяч руб.**

Узбуйненьне акрсаюзаў дасьць экономію ў 250 тысяч руб.

Рацыяналізацыя апарату сельска-гаспадарчай коопэрацыі дасьць экономію ў 130 тысяч руб.

І г. д. і г. д.

У сваёй рэзолюцыі пленум ЦКК адзначыў, што практычнае праводзеньне рэжыму экономіі **не пашло яшчэ па асноўнаму напрамку, вызначаному партыяй.** Некаторыя ўстановы ня толькі не экономяць, але займаюцца відавочна безгаспадарчымі справамі. Экономяць на пагоршэньні становішча рабочых.

Шмат, якія адказныя працаўнікі выкарыстоўваюць сваё службовае становішча для асабістых мэт. **Запазычанасьці па авансам дасягаюць салідных лічб.**

Па зьніжэньню цэн. Пленум ЦКК знаходзіць недастатковым зьніжэньне цэн на 1-е студзеня. Чаму?

— Шырокія рабочыя масы і профорганы слаба ўцягнуты ў кампанію.

— Увага друку да гэтай справы недастаткова.

— Асобныя гандлёвыя апараты градзкія і дарагія.

— Тавараправодзячая сыстэма неўпарадкавана.

— Практыкуецца парушэньне граічных накідак.

Але самае галоўнае—гэта тое, што **дагэтуль зьніжэньне цэн ідзе, галоўным чынам за кошт прыбыткаў, а не за кошт патаненьня і рацыяналізацыі апарату.**

Прэзыдыуму ЦКК даручана распрацаваць шэраг практычных мерапрыемств да ўцягненьня ўсяго савецкага апарату ў справу ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі па зьніжэньню цэн.

Асобная ўвага павінна быць зьвернута на **рацыяналізацыю вытворчасьці, зьніжэньне сабекошту шляхам упрашчэньня вытворчых процэсаў і ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны.**

* * *

Нашы гаспадарчыя працаўнікі, як, напрыклад, барысаўскія «гэроі лазьні»—часта бываюць блізарукія. Яны вельмі схільны пачаць экономію з рабочай лазьні, з зарплаты, з кур'ера і г. д.

Гэта—ня тое. Пачынаць трэба з галоўнага—з рацыяналізацыі апарату, скарачэньня накладных выдаткаў, упрашчэньня і паляпшэньня ўсёй сыстэмы працы.

Менш людзей—менш паперы—больш справы.

Гр.

„Тавары-любімчыкі“ і „тавары-пасынкі“.

Сярод нашых гандлёвых організацый не апошняе месца займае **„Беларускі ларок“**. Пачаўшы сваю дзейнасьць у 1925 годзе з некалькіх невялічкіх крам і нязначнага звароту, „Ларок“ зараз стаў буйнай установай, маючай шырокую сетку магазынаў і крам (32), раскіданых па ўсяму гораду, галоўным чынам, на ўскраінах.

Кампанія па зьніжэньню цэн не магла не закрануць **„Беларускі ларок“**, як дзяржаўна-гандлёвую організацыю. Пачаў зьніжаць „Ларок“ цэны 1-га кастрычніка мінулага году і з таго часу да сёньняшняга дню мае некаторыя дасягненьні.

Але ёсьць тавары, зьнізіць цэны на якія „Б. Л.“ да гэтай пары ня змог. Так напрыклад, мэтр паркалю, за які вы плоціце ЦРК 36 кап., тутака каштуе 38. Тое самае з Астраханскімі селядцамі, кілё каштуе ў Цэрабкопе 48 кап., а ў „Ларку“—54, з алеям („Ларок“ прадае па 53 кап. за кілё, а ЦРК па 48) і г. д. і г. д.

У выніку **спажывец лае абодвы організацыі—і „Ларок“ і Цэрабкоп.** Першы за цэны на паркаль, алей і селядцы, другі—за цэны на масла, рыс і інш., якія ў „Ларку“ танней чым у МЦРК.

Розьніца паміж цэнамі на тавары ў абодвых організацыях даволі значная.

Мы чакаем адказу „Беларускага ларка“ на наступныя запытаньні:

— Якія меры прыняты, каб утаніць сабекошт тавараў? (ці скарочаны штаты, накладныя выдаткі і інш.).

— Чаму ў тэмпэ зьніжэньня цэн „Б. Л.“ адстае ад МЦРК? (Апошні за сакавік месяц пасьпеў зьнізіць цэны на некаторыя тавары на некалькі разоў, чаго „Ларок“ не зрабіў).

— Чаму на некаторыя тавары цэны зьніжаны, а на некаторыя—не?

Чаму існуюць „тавары-любімчыкі і „тавары-пасынкі“?

Зэльцар.

У тры радкі:

15-га красавіка склікаецца **Менская Акруговая конфэрэнцыя страхавых кас.**

Беларускае таварыства „Чырвонага Крыжу“ яднае ў сваіх шэрагах **15 тысяч членаў.**

Па Менскай акрузе налічваецца **6800 беспрацоўных.**

20 тысяч рублёў адпушчана Наркамату Аховы Здароўя на **пашырэньне сеткі дзіцячых яселяў у БССР.**

5-га мая склікаецца **ўсебеларускі зьезд рабселькораў.**

Першыя ў БССР **гурткі турыстых** організаваны пры саюзах друкароў і саўгандслужачых.

У красавіку месяцы распачнуцца работы на **па пабудове Асінаўскай электростанцыі.**

24400 чалавек ліквідавалі сваю няпісьменнасьць у БССР за першыя 3 месяцы 1927 г.

У гэтым годзе **вышэйшыя пэдагогічныя курсы** выпушчаюць **80** пэдагогаў, белпэдтэхнікум—**289**, яўпэдтэхнікум—**98** і польпэдтэхнікум—**23** настаўнікі.

Адказы чытачам

Клімовічу (№ 888). Пры паступленьні ў тэхнікум ці ВНУ не абавязкова пасылаць самы дакуманты, можна пасылаць і копіі.

Казлову (№ 889). Пашлі запытаньне аб прычынах вызьніманьня цябе з вучоту ў Магілеўскі АК ЛКСМБ.

Ладзінскаму (№ 890). Профшкольцы-выпускнікі будуць прымацца без экзамінаў на апошні курс рабфаку па камандыроўкам адпаведных устаноў. Таксама бяз экзамінаў будуць яны прымацца ў тэхнікумы.

Кнізе М. (№ 991). Сувязь з рэдакцыяй **„Рабфак на дому“** можна наладзіць. Пішы па адрасу: г. Москва, Рождественка 4, Госиздат РСФСР, редакция **„Рабфак на дому“.**

Сушневічу (№ 892). У Менску ё с ь ц ь профшкола краўцоў. Падрабязгова аб прыёме ў яе будзе абвешчана асобна.

Я. К. (№ 893). Калі хлапец, аб якім ты пішаш, ня трымае ніякай сувязі з бацькамі, добра вытрыманы, праявіў сябе па грамадзкай працы, то яго можна прыняць у шэрагі ЛКСМБ.

За манастырскай агародай...

Там, дзе цяпер знаходзяцца вучэбна-вытворчыя майстэрні Менакрана, раней быў жаночы манастыр.

У маленькіх хмурых кельлях у малітвах і пастох «ачышчаліся» манашкі ад зямных грахоў і рыхтаваліся да сьмерці. Гнілы пах гэтых жывых трупаў і цяпер яшчэ чуецца тут... Чымсьці такім цяжкім і хаўтурным аддае ад шэрых сьцен доўгага, крывога калідору.

І дзіўна, што ў гэтых самых кельлях б'ецца іншае жыцьцё, разносіцца малады, радасны сьмех. Стук швэйнай машыны заглушае візг рубанку і пілы.

Вось **шавецкая майстэрня.** Шыпяць некалькі прымусаў. Віхрастыя галавы схіліліся над варштатамі, моцна забіваюць цьвічок за цьвічком... Малады белабрысы хлапчук у фартуху старанна працуе над парай «лодачак» з колернага шаўро.

— Сам зрабіў—горда заяўляе ён і, паставіўшы недаробленную пару на варштат, доўга любуецца ёю. Гэта яго першы вопыт.

— А я-б лепш зрабіў—кідае яго сусед— чарнявы, з запэцканым фарбай тварам—і крытычна абмацоўвае вачмі «лодачкі».

— Жартуеш... слабо табе такія «лодачкі»...

Сярод іх маецца шмат добрых работнікаў. Аб гэтым кажуць шматлікавыя пары боцікаў, чаравічкоў і іншых вырабаў «тонкага рамясла», якія выстраіліся на прылаўку доўгім прыгожым шэрагам...

У сталярнай майстэрні пахне піленым дрэвам, клёнам і дубам. Тут значна сьвятлей, чым у шавецкай. Белыя стружкі прыемна хрумсьцяць пад нагамі. У майстэрні стаяць гатовыя вырабы. Галоўным чынам вылучаецца дубовы буфэт, зроблены вучнем **Ягоравым.** Праўда, гэты буфэт зроблен пад кіраўніцтвам інструктара, але ўсё-ж такі гэта кажа аб вялікіх дасягненьнях вучня. Побач—сталы, тубарэткі, этажэркі—гэта ўсё зрабілі маладыя спрытныя рукі будучых майстроў.

Насупроць сталярнай знаходзіцца **сьлясарная майстэрня.** Звон і дрынчэньне бляхі. Шопат вугольляў у жароўні. Маладыя сьлясары робяць бакі для малака і вёдры. Гэта майстэрня нядаўна організавалася, але абяцае зрабіцца аднэй з найлепшых.

Калі ў першых трох майстэрнях працуюць амаль выключна адны хлапцы, то ў двух другіх — яўная **«гегемонія» дзяўчат.**

У **«швэйнай дамскага адзеньня»** адны дзяўчаты. А ў «нерацлётнай» адзінокія галовы хлапцоў у моры чырвоненькіх хустак здаюцца «ня з гэтага полю ягадамі».

Хто яны—усе гэтыя працуючыя падросткі?

Яны прышлі з дзіцячых дамоў, з вуліцы, з вакзалаў, мінулае іх—голад і цемра, будучае—жыцьцё!

* * *

У майстэрнях вельмі мала зварочваюць увагу на **чыстату.** У асаблівасьці гэта адчуваецца ў шавецкай, дзе сьмяцьцё відавочна ніколі не пакідае падлогу.

Да недахопаў можна таксама аднесьці **недастатковую стыпэндыю.** Тры чвэрткі гэтай скуднай стыпэндыі ўходзіць на ежу, а астатнія грошы ў суме трох рублёў павінны ісьці на адзеньне, але ўходзяць у большасьці на кіно і іншыя дробныя выдаткі. Адсюль, нам здаецца, можа быць адзіным выхадам павялічэньне нагрузкі майстэрняў і побач з гэтым, павялічэньне стыпэндыі.

Хай маладое жыцьцё за манастырскай агародай б'ецца яшчэ больш бадзёра і ўпэўнена.

Г—н.

Упарадкаваць тэатральную справу

У першых лічбах мая месяцу Галоўполітасьветы склікае пашыраную тэатральную нараду, у якой прымуць удзел прадстаўнікі Наркамасьветы, друку, профорганаў, дзяржтэатраў і літаратурных організацый.

Нарада абгаворыць шэраг важных пытаньняў па ўпарадкаваньню тэатральнай справы ў БССР (рэпэртуар тэатральнае крытыка, тэатральныя напрамкі, клюбны тэатр і г. д.

Зьмена расьце

На 1-е студзеня 1927 году ў БССР (разам з Гомельшчынай) налічвалася **1873 піонэрскіх атрадаў**, з якіх у гарадох маецца 482, а па вёсках 1089 атрадаў.

Агульны лік піонэраў у БССР дасягае **76,054**, з якіх комсамольцаў **5306** (7,5 проц. у адносінах да агульнага ліку піонэраў).

Шэрагі акцябрат па БССР таксама хутка растуць. Усяго акцябрат маецца 9571.

Зборнік перавальцаў

Гэтымі днямі выходзіць у сьвет зборнік вершаў перавальскіх поэтаў Гр. Бунтара, М. Залетнага і І. Нікіфарава пад назваю „Самое роднае“.

Зборнік выпускае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі.

ВЯЛІКІ КОНЦЭРТ У КЛЮБЕ КАРЛА МАРКСА

У аўторак 12-га красавіка, у памяшканьні клюбу Карла Маркса рэдакцыя газэты **„Чырвоная Зьмена“** наладжвае для рабочай, служачай і вучнёўскай моладзі Менску вялікі концэрт, прысьвечаны творам композітара **Людвіка Бэтговэна.**

Концэрт будзе пастаўлены сіламі студэнтаў **Дзяржаўнага Музтэхнікуму.**

Програма яго раскладаецца на 3 часткі:

1. **„Бэтговен і сучаснасьць“** — уступнае слова Ю. Дрэйзіна.
2. **Аддзяленьне камернай музыкі.**
3. **Аддзяленьне сымфонічнай музыкі.**

Білеты прадаюцца кожны дзень у рэдакцыі **„Чырвонай Зьмены“** (Комсамольская, 25) у тав. **Шмуклер.**

Цана білетам ад 15 да 50 кап.

—|—

Комсамольскія ячэйкі, юнсэкцыі профклюбаў, студкомы і школькомы, організуйце колектыўнае наведаньне концэрту.

Аб усім.
Першы ў СССР.

У Маскве на могільніку былога Данскога манастыра дабудоўваецца **першы ў СССР** крэматоры для спальваньня мерцьвякоў.

Яшчэ перад рэволюцыяй на тым самым месцы, дзе зараз будуецца крэматоры, будавалася манахамі царква-ўсыпальніца. Набудова каштавала «бедным» манахам нямнога і ня мала, а 200 тысяч рублёў.

Гэтая зацея манахаў Данскога манастыра прышлася чамусьці не да густу «Святейшего Синода», і ён шле ў манастыр загад, які забараняе дабудоўваць усыпальніцу, матывіруючы тым, што гэта зьяўляецца парушэньнем «рэлігійна-абраднай часткі. Чалавек ад зямлі створаны і ў зямлю павінен пайсьці».

У 1910 годзе пабудова ўсыпальніцы спынілася. Цяпер Савецкая ўлада парашыла перабудаваць усыпальніцу ў крэматоры.

Спальваньне мерцьвякоў завецца замежным словам крэмацыя, ад таго і месца дзе яно адбываецца, завецца—**крэматоры.**

Спальваньне мерцьвяка адбываецца ў асоба прыстасаванай крэмацыйнай печцы. Печка ацяпляецца коксам—вуглем, які дае вялікую тэмпэратуру, але выкарыстоўваецца ня полымя, а высокая тэмпэратура, якой награецца асобная камара, ўнутры якой кладзецца мерцьвяк.

Камера робіцца з асобага сорту цэглы, так званай лікальнай. Кожная цэгла важыць да 20 пудоў. Калі крэмацыйная печка топіцца, дык агонь награвае надворны бок камеру і цэглы даводзяць тэмпэратуру паветра ўнутры камары да 1000 градусаў. У гэту камеры пры дапамозе пад'ёмнай машыны апушчаецца дамавіна з мерцьвяком. Дзякуючы высокай тэмпэратуры драўляная дамавіна адразу згарае і мерцьвяк ападае на дно камары, на пруты з агняўпорнай гліны. Мерцьвяк хутка ператвараецца ў попел, які падае праз вузкія дзіркі на асобную пляцоўку.

Увесь процэс спальваньня мерцьвяка цягнецца паўтары гадзіны.

Санітарнае значэньне спальваньня мерцьвякоў—вельмі вялікае. Шляхам спальваньня зьнішчаецца вялікая колькасьць шкодных мікробаў, якія заражаюць зямлю на могілках. Адпадае пытаньне аб пашырэньні зямлі пад могілкі.

У мінулы час пад могілкі аддаваліся лепшыя вучасткі зямлі, царква катэгорычна протэстовала супроць спальваньня мерцьвякоў.

За мяжой-жа востры недахоп зямлі прымусіў хутка пайсьці на шлях пабудовы крэматорыяў. Першы крэматоры ў сьвеце быў пабудаваны ў Італіі ў 1876 г. у горадзе Мілане.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867, Менск, 2 друкарня БДВ.